Sputnik Беларусь

26.04.2018

# Што можна ўбачыць на фестывалі сучаснага мастацтва "Арт-Мінск"




Больш за 800 заявак, 250 мастакоў з усяго свету і 18 буйных сталічных пляцовак – гэта статыстыка Першага міжнароднага фестывалю мастацтваў, які напярэдадні адкрыўся ў Мінску.

Задумка арганізатараў — зрабіць беларускую сталіцу адзінай выставачнай пляцоўкай. Экспазіцыя у Палацы мастацтваў стане цэнтральнай кропкай фестывалю, у якім таксама ўдзельнічаюць Нацыянальная бібліятэка, Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў, Мемарыяльны музей-майстэрня З. І. Азгура, Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў, мастацкая галерэя "БелАрт", галерэі A&V, "ДК", "Арт-Порт", Blique, "Прадмесце" "Арт Хаус" і іншыя.

Для аматараў сучаснага мастацтва арганізатары нават падрыхтавалі спецыяльную картку, набыўшы якую, кожны жадаючы зможа наведаць самыя цікавыя пляцоўкі.

Прадстаўленыя ў Палацы мастацтваў работы — яркія, эпатажныя, эмацыйныя і незвычайныя — можна будзе ўбачыць да 20 мая. Незалежны куратар выставы — італьянскі арт-крытык Стэфана Антанэлі высока ацаніў патэнцыял беларускіх мастакоў і нават выказаў ідэю арганізацыі культурных абменаў паміж Беларуссю і Італіяй. Па яго словах, атрымалася выстава нават не еўрапейскага, а сусветнага ўзроўню.

Глядзіце ў фотастужцы Sputnik, што можна ўбачыць на адной з пляцовак міжнароднага фестывалю.